


# «Варта ісці не насустрач адно аднаму, а разам у адным кірунку»

**Ірына ДАЎГАЛА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве, дэлегат Усебеларускага народнага сходу.**


house.gov.by

Працуючы ў органах дзяржаўнай улады, яна была пэўным чынам датычная да падрыхтоўкі Усебеларускіх народных сходаў, а сёлета ўжо ў другі раз займела і статус дэлегата. Ірына Віктараўна падзялілася сваімі чаканнямі ад мерапрыемства і растлумачыла, чаму мяркуе, што беларусам лепш ісці не насустрач адно аднаму....

— Формы народаўладдзя ў выглядзе з'ездаў, сходаў уяўляюць сабой удзел у абмеркаванні пытанняў прадстаўнікоў усіх рэгіёнаў краіны, працаўнікоў разнастайных галін, членаў шырокага кола партый і грамадскіх аб'яднанняў. І ў бягучым годзе на Усебеларускім народным сходзе будуць прадстаўлены інтарэсы і праблемы ўсіх слаёў насельніцтва. Сход, як бы яго ні крытыкавалі, — форма, якая сябе ўжо зарэкамендавала. На Усебеларускім народным сходзе збіраюцца людзі, каб вырашаць сацыяльныя, эканамічныя і іншыя праблемы, якія важныя сёння для ўсёй дзяржавы і для кожнага асобна ўзятага чалавека.

Я доўгі час працавала ў дзяржаўных органах і нават ускосна мела дачыненне да падрыхтоўкі самага першага Усебеларускага сходу ў 1996 годзе. Адзначу, што кожны сход меў свае асаблівасці. Так, у 2010 годзе ў ім бралі ўдзел 13 Герояў Савецкага Саюза і Герояў Сацыялістычнай працы. У маёй Гомельскай вобласці, якую я прадстаўляю ў парламенце, на жаль, больш Герояў Савецкага Саюза не засталося. Тэматыку форумаў падкрэсліваюць і яго лозунгі, якія кожны раз новыя. Але на ўсіх сходах у абавязковым парадку прымалася Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на пяць гадоў.

Цікава, што на самым першым Усебеларускім народным сходзе была ініцыятыва па змяненнях у Канстытуцыю. І сёння чаканні дэлегатаў ад гэтага форуму звязаныя з абмеркаваннем наваўвядзенняў у Асноўны Закон краіны. Канстытуцыя — гэта платформа, ад якой будуць ісці астатнія заканадаўчыя акты, кодэксы, нарматыўна-прававыя акты. На гэтым зводзе нормаў наогул будзе будавацца жыццё беларускага народа.

Дарэчы, дадам вось яшчэ што. Ідуць звароты і прапануюцца думкі, каб у краіне пакінулі адну дзяржаўную мову. Дык вось, двухмоўе было прапанавана замацаваць менавіта на сходзе ў 1996 годзе. Сёння праблем з гэтым у нас няма, і дзве мовы нармальна суіснуюць. І беларускай, і рускай мовам месца ў нашай краіне ёсць.

Вельмі цікавая і неабходная форма гутаркі, на якую я хачу звярнуць увагу іншых дэлегатаў, — дыялогавыя пляцоўкі. Іх неабходна пакінуць у нашым асяроддзі, яны патрэбны як паветра. Нам важна знайсці кампраміс, які дазволіць пачуць кожнага і працаваць на стварэнне, а не на разбурэнне.

Яшчэ адзін вельмі значны момант — тое, што сёлета аб'яўлены Год народнага адзінства. На маю думку, з гэтага вынікае некалькі важных складнікаў. Па-першае, год пачынаецца з найважнейшай падзеі — Усебеларускага народнага сходу. Па-другое, у 2021-м будзем успамінаць 80-годдзе з пачатку Вялікай Айчыннай вайны — вялікага гора, якое напаткала наш народ і якое аб'яднала ў цяжкі час. Таму тэма народнага адзінства вельмі трапная. Трэба спыніцца, як той казаў, выдыхнуць і пайсці не насустрач адно аднаму, а ў адным кірунку. Калі мы будзем ісці насустрач адно аднаму, мы сустрэнемся, але потым кожны зноў пойдзе ў свой бок. Таму я кажу: варта ісці не насустрач адно аднаму, а разам у адным кірунку.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# «Відавочна, трэба шукаць новыя пункты росту, каб рухацца далей»

**Юлія РАГАШЧУК, намеснік загадчыка арганізацыйна-кадравай работы Брэсцкай абласной арганізацыі ГА «БРСМ», член Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь:**



— Сёння арганізацыя дыскусійных пляцовак, з майго пункту гледжання, дазволіла згуртаваць народ нашай краіны. Разглядаюцца розныя пытанні, якія датычацца ўсіх сфер жыццядзейнасці грамадства. Немалаважны той факт, што гэтыя дыскусіі закранаюць будучыню Беларусі. Бо розныя па сваёй прафесійнай дзейнасці, меркаваннях і поглядах людзі аб'ядноўваюцца для прыняцця адзінага рашэння наконт развіцця дзяржавы ў найбліжэйшую пяцігодку.

Мне цікава далейшае развіццё дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, якія будуць змяненні і дапаўненні. Відавочна, што ўжо нямала робіцца ў гэтым кірунку, але трэба шукаць нейкія новыя пункты росту, каб рухацца далей.

На VI Усебеларускім народным сходзе я буду ўпершыню. Гатовая быць актыўным удзельнікам дыялогу, прапаноўваць канструктыўныя ідэі на карысць нашага грамадства.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# «Будучыня нашай вёскі — за аграгарадкамі»

**Лілія СЛУЦКАЯ, сацыяльны работнік тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дэпутат Маркаўскага сельскага Савета Маладзечанскага раёна:**


Фота Аляксея ПЛОТКІ.

— Усебеларускі народны сход, як і кожная знакавая падзея нацыянальнага маштабу, гэта, акрамя іншага, яшчэ і нагода кінуць позірк у недалёкае мінулае, зрабіць пэўныя параўнанні і высновы. Я пастаянна ў кантакце з людзьмі, бачу, як яны жывуць сёння, нярэдка параўноўваю з тым жыццём, якое было ў іх адносна нядаўна. І мае параўнанні на карысць сённяшняга дня.

Наш аграгарадок Маркава — невялікі населены пункт, у ім каля сямісот жыхароў. Тут дзве сельгасарганізацыі, у якіх працуе асноўная колькасць маіх аднавяскоўцаў, ёсць сярэдняя школа, дзіцячы садок, урачэбная амбулаторыя, дзве крамы, пошта, больш-менш прыстойныя дарогі. Напрыклад, летась заасфальтавалі калі пяці кіламетраў дарогі паміж вёскамі Клочкава і Ленкаўшчына. Іх жыхары цяпер вельмі задаволены. Карацей, ёсць усё для нармальнага жыцця, спалучэння выгод навакольнага прыроднага асяроддзя і гарадскіх умоў.

Важная прыкмета часу: за апошнія тры-чатыры гады да нас патроху сталі пераязджаць гараджане, адносна нядаўна пераехала з аддаленага населенага пункта шмадзетная сям'я. У нас выдзяляюцца зямельныя ўчасткі пад будаўніцтва жылля, да якога ёсць магчымасць падключыць прыродны газ. Гэта прываблівае маладых забудоўшчыкаў. І я ўсё больш пераконваюся ў думцы, што будучыня беларускай вёскі за аграгарадкамі.

Не адкрыю Амерыку, калі скажу, што зямля — наша агульнанацыянальнае багацце, якім трэба даражыць і пра які неабходна ўсяляк клапаціцца. Зямля па-ранейшаму корміць вяскоўцаў. Я маю на ўвазе не толькі ўраджаі, прыбаўленні ў вазе і надоі сельскіх гаспадарак, але і здабыткі прыватнага сектара вясковых падворкаў. Іх унёсак у харчовую бяспеку краіны ўнушальны. У Беларусі зараз налічваецца больш за 900 тысяч асабістых падсобных гаспадарак, у якіх вырабляюцца сотні тысяч тон бульбы, агародніны, збожжавых і зернебабовых, свініны, мяса птушкі і іншай сельскагаспадарчай прадукцыі на мільярды рублёў.

Можна падлічыць, колькі калгасаў, кажучы па-савецку, замяняюць вясковыя гаспадары, якіх, на маю думку, мясцовым уладам трэба стымуляваць, павышаць матывацыю вядзення асабістай дапаможнай гаспадаркі. І на дзяржаўным узроўні абавязкова падтрымліваць вясковыя падворкі, заахвочваць іх гаспадароў трымаць кароў, гадаваць бычкоў, птушак. Няхай адзін жывёлагадоўчы комплекс замяняе сотні хлеўчукоў, тым не менш скажу з уласнага досведу шчыра: ежа з вясковых падворкаў больш смачная і прывабная. Мая сям'я мае невялікі агарод. Ён усяго тры сотачкі, але нам хапае для самазабеспячэння агароднінай, садавінай, ягадамі. Садзім бульбу на іншым участку. Раней трымалі карову.

Нашы дэпутаты Маркаўскага сельскага Савета імкнуцца рабіць усё магчымае для падтрымкі прысядзібных падворкаў: выдзяляюць зямлю, дапамагаюць з кармамі, тэхнікай для ўборкі, заахвочваюць гаспадароў трымаць кароў, гадаваць бычкоў і іншую жывёлу. Бо гэта ў першую чаргу сродак самазабеспячэння сям'і якасным экалагічна чыстым харчаваннем, дадатковая крыніца даходаў жыхароў сельсавета.

Сёння мае думкі, прапановы да сходу — пра будучы дзень беларускай вёскі. У Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2021—2025 гг. лічу неабходным вызначыць комплекс мер, якія будуць накіраваныя на павышэнне эфектыўнасці выкарыстання зямлі. Трэба супрацьстаяць тэндэнцыі зніжэння долі вясковых гаспадарак у агульным аб'ёме вытворчасці сельгаспрадукцыі. Дапамога сельскай гаспадарцы краіны, у тым ліку і асабістым дапаможным гаспадаркам, павінна быць у дзяржаўным прыярытэце.

Надышоў час канчаткова навесці парадак на зямлі. Не сакрэт, што вялікая колькасць зваротаў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання з рэгіёнаў у органы мясцовай улады, у вышэйстаячыя інстанцыі — пра зямлю. Нездарма нашы парламентарыі, у прыватнасці члены Савета Рэспублікі, кажуць, што ў грамадстве даўно наспела пытанне сутнаснага ўдасканалення заканадаўства аб ахове і выкарыстанні зямель, сістэмнай рэвізіі і канцэптуальнага перагляду гэтых праваадносін, у тым ліку перагляду неактуальных і непрымяняльных на практыцы нарматыўных прадпісанняў.

**Леанід ТУГАРЫН.**